Источник: "Беларуская думка" - №9, 2014-09-22



# Пачуццё Бацькаўшчыны

## Да 85-й гадавіны Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі



**Аляксандр КАВАЛЕНЯ, доктар гістарычных навук, прафесар**

**Адкрыццё 15 кастрычніка 1929 года Інстытута гісторыі Беларускай акадэміі навук з'явілася важнай грамадска-палітычнай і навукова-культурнай падзеяй у жыцці беларускага грамадства. Гэты арыгінальны і аўтарытэтны навуковы цэнтр быў заснаваны дзякуючы нацыянальнай свядомасці грамадска-палітычных дзеячаў і таленавітай плеядзе айчынных вучоных-гісторыкаў, якімі ганарыцца беларускі народ.**

**З першых дзён дзейнасці Інстытута быў разгорнуты непарыўны працэс вывучэння гісторыі беларускага народа, накіраваны на кансалідацыю беларускага грамадства і ўмацаванне беларускай дзяржаўнасці. Сёння калектыў вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі захоўвае лепшыя традыцыі і трывала займае пазіцыю «генеральнага штаба гістарычнай навукі» нашай суверэннай дзяржавы.**

Беларускі народ мае вельмі багатую гісторыю, у якой не толькі безліч цяжкіх выпрабаванняў, што выпалі ў працэсе фарміравання нацыі і дзяржаўнай незалежнасці, але і веліч стваральнай працы многіх пакаленняў. За гэты працяглы час была назапашана непаўторная духоўна-культурная спадчына, якая з'яўляецца не толькі нацыянальным гонарам, але ўпрыгожвае і ўзбагачае сусветную цывілізацыю. У складаным і супярэчлівым працэсе культурна-гістарычнага развіцця ўмацоўвалася нацыянальная самасвядомасць беларускага народа, фарміравалася яго дзяржаўнасць. Магутны ўнутраны духоўны і інтэлектуальны патэнцыял нашага народа даў магчымасць здабыць і зацвердзіць гістарычнае права «людзьмі звацца», вызначыць сваю гуманістычную самакаштоўнасць у бурнай сацыягістарычнай плыні XXI стагоддзя.

Суверэннае развіццё Беларусі апошнім часам усё больш прыкметна выяўляе ўзаемасувязь палітыкі і эканомікі, дэмакратызацыі палітычных структур і лібералізацыі эканамічных адносін. Аднак мадэрнізацыя сацыяльна-эканамічнага механізма, накіраванага на інавацыйнае развіццё Беларусі, можа быць паспяховай тады, калі ў грамадстве зацвердзіцца ідэя неабходнасці не толькі разгортваць працу, каб развіваць новыя тэхналагічныя ўклады, што вызначаюць сутнасць постындустрыяльнага, інфармацыйнага грамадства, але, самае галоўнае, разуменне важнасці развіцця гуманітарнага рэсурсу – адукацыйнага, ідэалагічнага, маральнага. Менавіта гуманітарныя веды ў значнай ступені вызначаюць прагрэс грамадскага развіцця. Яны павінны не знаходзіцца «на абочыне» мадэрнізацыйных працэсаў, а наадварот, з'яўляцца іх ключавым фактарам, іх рухальнай сілай. Гістарычны вопыт пераканаўча сведчыць, што моц дзяржавы не толькі ў вытворчых магутнасцях і сілавых структурах, а, перш за ўсё, у духоўна-маральных якасцях народа, пачынаючы з простага рабочага, дзяржаўнага клерка і міністра. Выхаванне прыстойных людзей, іх грамадзянскіх якасцей, патрыятызму і годнасці – найважнейшая задача грамадства. Гэта павінны быць не лозунгі, а пастаянная напружаная праца, у тым ліку і навукоўцаў-гуманітарыяў, якія абавязаны забяспечваць навуковы маніторынг стану і тэндэнцый сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сітуацыі, духоўна-культурнага жыцця ў краіне, выпрацоўваць абгрунта-

*У сувязі з 85-годдзем Інстытута гісторыі НАН Беларусі рэдакцыя часопіса шчыра віншуе калектыў навуковай установы, жадае творчага запалу і адметных вынікаў у распрацоўцы гістарычнай спадчыны беларускага народа!*

Источник: "Беларуская думка" - №9, 2014-09-22



ваныя рэкамендацыі, каб пазбягаць памылак і паспяхова разгортваць далейшае будаўніцтва беларускага грамадства.

## Духоўна-культурнае самаасэнсаванне

Вопыт пераканаўча сведчыць, што ўстойлівасць грамадскай сістэмы спрадвеку звязана з гістарычнай памяццю і гістарычнай свядомасцю людзей, якія прама ці апасродкавана ўплываюць на сацыяльна-палітычную практыку. Гэтыя ўзаемна ўплывовыя працэсы маюць складаны механізм узаемадзеяння і адлюстроўваюць як рэальны гістарычны вопыт, так і міфатворчыя ідэі. Менавіта гістарычнае пазнанне як працэс навуковага асэнсавання рэчаіснасці і гістарычныя веды як вынік гэтага працэсу з'яўляюцца найважнейшымі элементамі структуры гістарычнай свядомасці грамадства. Гістарычная памяць як феномен грамадскай свядомасці фарміруецца шляхам распаўсюджвання ў масавай свядомасці здабытых навукай ведаў у працэсе асэнсавання гістарычнага працэсу. Іх шырокае ўкараненне ў духоўна-культурнае жыццё людзей адыгрывае вызначальную ролю ў фарміраванні ідэнтычнасці народа, садзейнічае фарміраванню грамадзянскіх і патрыятычных якасцей людзей, актывізуе іх асэнсаваны ўдзел у будаўніцтве незалежнай, свабоднай і багатай Беларусі.

Менавіта на гэтую важную праблему звярнуў увагу Прэзідэнт краіны А.Р. Лукашэнка, калі выступаў на нарадзе перад вядучымі навукоўцамі ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі 31 сакавіка 2014 года. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гуманітарныя навукі – гэта, перш за ўсё, навукі ідэалагічныя. Сёння настаў час абагульніць вопыт існавання суверэннай Беларусі, вылучыць, сістэматызаваць і выкарыстоўваць у ідэалагічнай працы ўсё тое, што дапаможа кансалідацыі грамадства і ўмацаванню адзінства нацыі, Гуманітарныя навукі павінны служыць ідэйным падмуркам грамадска-палітычнага развіцця краіны, з'ўляцца важным інструментарыем распрацоўкі абгрунтаванай стратэгіі дзяржаўнага кіравання, якая адпавядае сучасным патрабаванням і будзе садзейнічаць кансалідацыі людзей на аснове вывучэння і папулярызацыі гістарычнай і культурнай спадчыны беларускага народа *[1]*.



▲ Прэзідэнт А.Р. Лукашэнка ў час нарады з вядучымі навукоўцамі па пытанні перспектыў развіцця навукі. НАН Беларусі, 31 сакавіка 2014 года

Сапраўды, бяспамяцтва і страта пераемнасці нацыянальнай духоўна-культурнай спадчыны – гэта праклён для кожнага народа, яго асуджанасць на незайздросную долю аб'екта гісторыі. Вышэйшай сутнасцю зацвярджэння суверэнітэту Рэспублікі Беларусь як унікальнага цывілізацыйнага цэнтра ёсць суверэнітэт духоўны. У яго аснове ляжаць духоўна-маральныя каштоўнасці, якія вытрымалі выпрабаванне часам і падтрымліваюцца большасцю народа. Вызначальны ўплыў у працэсе фарміравання духоўна-культурнай прасторы Беларусі аказвала этнічная славянская аснова, а таксама пастаянныя сувязі і ўзаемадзеянне з усходнямі і заходнямі цывілізацыйнымі прасторамі. Беларускія землі на працягу ўсяго перыяду гістарычнага развіцця і сёння з'яўляюцца

**ПРА АЎТАРА**

**КАВАЛЕНЯ Аляксандр Аляксандравіч.**
Нарадзіўся ў 1946 годзе ў г. Капыль Мінскай вобласці. У 1975 годзе скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага. Працаваў на кафедры гісторыі КПСС Мінскага педінстытута. З 1983 па 1991 год быў членам Рэспубліканскага каардынацыйнага савета па вырашэнні праблем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. З 1996 года – загадчык кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка. З кастрычніка 2004 года – дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі.
З 2009 года – акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі.
Доктар гістарычных навук (2000), прафесар (2004).
Аўтар больш як 300 навуковых і навукова-педагагічных прац, у тым ліку 8 манаграфій і 14 адукацыйна-метадычных дапаможнікаў.
Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя Вялікай Айчыннай вайны, нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларусі.

Источник: "Беларуская думка" - №9, 2014-09-22





своеасаблівай кантактнай цывілізацыйнай айкуменай, што, несумненна, уплывае на фарміраванне нацыянальнай структуры грамадства, яго традыцый і культуры. Яе складнікамі была культура сялян, мяшчан, насельніцтва гарадоў і мястэчак і, несумненна, памесна-дваранская культура сярэдняй і дробнай шляхты і магнатаў.

Фарміраванне духоўна-культурнага самаасэнсавання сягае ўглыб гісторыі беларускага народа. Ужо ў Полацкай *[2]* і Тураўскай *[3]* землях ствараецца шэраг арыгінальных твораў, што з'яўляецца пераканаўчым сведчаннем высокага ўзроўню палітычнага і культурнага развіцця, дасягнутага ў гэтых княствах. Поспех у вырашэнні задач дзяржаўнага будаўніцтва ў перыяд Полацкага, Тураўскага княстваў і ВКЛ сведчыць пра канструктыўны характар абранай ідэалогіі, заснаванай на каштоўнасцях хрысціянства. У цэлым ідэалагічны і палітычны арсенал уздзеяння рэлігіі быў даволі магутным і разнастайным. Прыняўшы хрысціянства, перш за ўсё як сродак маральнага самавызначэння ў адносінах да каштоўнасцей жыцця, а не як карціну свету, жыхары беларускіх зямель тым самым заклалі падмурак фарміравання спецыфічнага этнаканфесіянальнага менталітэту беларускага народа. Светапоглядней яго асновай былі духоўныя традыцыі народа, сфарміраваныя ў працэсе працяглага шляху развіцця грамадскіх адносін. Духоўныя каштоўнасці і традыцыі выступаюць квінтэсенцыяй гістарычнага лёсу народа, яго культурнай спадчыны, яны ўвасабляюць вопыт мінулых пакаленняў, асаблівасці прыналежнасці да вызначанага цывілізацыйнага тыпу. У духоўнай і ідэалагічнай сферы хрысціянства абапіралася на багатую кніжна-пісьмовую традыцыю і было адначасова сродкам яе зацвярджэння ў грамадскай свядомасці. Паступова адбываўся культурны ўздым, развівалася асвета, распаўсюджвалася пісьменства і назапашванне навуковых ведаў.

## Рэнесансныя і рэфарматарскія плыні

У наступны гістарычны перыяд фарміравання беларускай этнічнай супольнасці ў XIV–XVIII стагоддзях агіяграфічны жанр захаваў і прадоўжыў сваё адносна шырокае існаванне. З улікам канкрэтных гістарычных абставін ён відазмяняўся і трансфармаваўся, але заставаўся важнай часткай агульнай структуры старажытнабеларускага пісьменства, сродкам сцвярджэння прынцыпаў і ідэй пануючага рэлігійнага светапогляду. Пад уздзеяннем сацыяльна-грамадскіх і духоўна-культурных трансфармацый традыцыйныя віды і жанры пісьменства паступова саступаюць месца новым. Літаратура становіцца ўсё больш свецкай і дэмакратычнай, у ёй выяўляюцца значныя рэнесансныя і рэфарматарскія плыні. У канцы XV – пачатку XVI стагоддзя складваецца новая гуманітарная культура.

Вядомым дзеячам усходнеславянскага Адраджэння пачатку XVI стагоддзя быў Францыск Скарына (каля 1490 – каля 1541). Перакладаючы на беларускую мову Біблію, ён імкнуўся пашырыць пісьменства ў асяроддзі народа. У напісанай прадмове Скарына адзначаў, што Біблія з'яўляецца асноўным сродкам асветы, скарбніцай ведаў і жыццёвай мудрасці. Яго ідэі аказалі вялікі ўплыў і на развіццё літаратуры XVI–XVII стагоддзяў. Духоўна-культурнае жыццё ўзбагацілася творамі Мікалая Гусоўскага (1470-я – пасля 1533), Сымона





▶ Выданні Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Беларуская думка

Источник: "Беларуская думка" - №9, 2014-09-22





Буднага (каля 1530 – 1593), Андрэя Волана (пасля 1530 – 1610), Васіля Цяпінскага (1530-я – каля 1600), Мялеція Сматрыцкага (1577–1633), Сімяона Полацкага (1629–1680), Казіміра Лышчынскага (1634–1689) і многіх іншых. Услед за Скарынам яны адстойвалі эстэтычную каштоўнасць роднай мовы як асноватворнага сродку самавыяўлення народа, захавання яго гісторыі і культуры. Галоўнай асаблівасцю беларускай культуры гэтага перыяду быў яе полілінгвістычны характар. Узнікшы на скрыжаванні ўсходнеславянскай і заходнееўрапейскай цывілізацый, яна развівалася пад уздзеяннем праваслаўнай і каталіцкай духоўных традыцый. Адметнасць духоўна-культурнага жыцця характарызавалася ўвасабленнем і ўзаемадзеяннем беларускай, стараславянскай, літоўскай, польскай і лацінскай плыняў.

Як уяўляецца, беларускія землі ў той час з'яўляліся своеасаблівым праваднікам візантыйскіх ідэй на захад і заходніх на ўсход. Гістарычны млын драбіў, прасейваў, адбіраючы ўсё адметнае, каб замацаваць на генетычным узроўні, захаваць і перадаць будучым пакаленням лепшыя грамадзянскія якасці і духоўна-культурныя традыцыі. Гэта дало магчымасць нашым таленавітым продкам першымі ў Еўропе стварыць на старабеларускай мове звод законаў (Статут Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 гадоў). Так, Статут 1588 года – кадыфікацыйны акт, які вызначаў дзяржаўны лад Вялікага Княства Літоўскага. Усе нормы Статута прасякнуты ідэяй станаўлення прававой дзяржавы, у якой дзейнасць усіх дзяржаўных органаў і службовых асоб павінна цалкам адпавядаць праву. Ідэя прававой дзяржавы, накіраваная, перш за ўсё, супраць самавольства буйных феадалаў і сярэднявечнай тэакратычнай тэорыі паходжання і сутнасці дзяржавы, была сфармулявана Л. Сапегам. У звароце падканцлера ў сувязі з прыняццем Статута было адзначана: «...для того права суть постановлены, абы можному і потужному не все было вольно чынити. Яко Цыцеро поведилъ, ижъ естесмо невольниками правъ для того, абысьмы вольности уживати могли… И слушне за правду маемъ, за што пану богу дяковати, же под пановањемъ королей ихъ милости и великихъ князей, пановъ наших, тую владзу и вольность у рукахъ своих маемъ, а права сами собе творачы, яко найбольшей можем, волности своее во всем постерегаем, бо не только сусед а спольный нашъ обыватель в отчизне, але и сам господаръ, пан нашъ, жадное звирхности над нами заживати не может, одно толко, колко ему право допушчает» *[4, с. 553–554]*.

У Статуце былі абагульнены тагачасныя дзяржаўна-прававыя ідэі, некаторыя з іх апярэджвалі свой час. У адрозненне ад падобных кодэксаў Заходняй Еўропы, дзе карысталіся рымскім правам, выкладзеным на лаціне, Статут быў напісаны на старабеларускай мове. У ім шырока выкарыстоўваліся характэрныя для насельніцтва беларускіх зямель словы і сэнсавыя звароты. Шмат якія артыкулы выкладаліся такім чынам, што нават не патрабавалася іх тлумачэння або каментавання. Ён быў даступны і зразумелы значнай частцы простых людзей. На працягу ўсяго XVI стагоддзя беларуская мова ў ВКЛ шырока ўжывалася ў юрыдычным і актавым справаводстве і выконвала функцыю афіцыйнай дзяржаўнай мовы. Як справядліва адзначаў вядомы беларускі мовазнавец А.І. Жураўскі, гэта была эпоха росквіту дзелавога пісьменства на беларускай мове. У гэты перыяд на беларускай мове пісаліся дэкрэты соймаў і Галоўнага літоўскага трыбунала, акты копных, гарадскіх, земскіх і падкаморскіх судоў, акты і прыходна-расходныя кнігі гарадскіх управ, магістратаў, рэестры, фундушы і інвентары маёнткаў, старостваў, фальваркаў і вёсак, завяшчанні, прыватныя лісты і іншыя дакументы *[5]*.

Створаныя ў велікакняжацкай канцылярыі актавыя кнігі – не толькі выключна важная гістарычная крыніца, вядомая пад назвай «Літоўская метрыка», але і каштоўны помнік культуры, што выступае мерай духоўнасці, цывілізаванасці і этнічнай адметнасці беларускага народа. Увядзенне ў грамадскую практыку старабеларускай мовы мела выключна важнае значэнне для фарміравання этнакультурнай самасвядомасці мясцовага насельніцтва ВКЛ, аказвала вызначальнае ўздзеянне на станаўленне беларускага этнасу. Як вядома, дакументы з канца XIV да пачатку XVII стагоддзя ў сваёй большасці былі напісаны на старабеларускай мове, пазнейшыя – на польскай і лацінскай.

Адзначым, што вывучэнне і папулярызацыя гісторыка-культурных дасягненняў беларускага народа маюць надзвычай важнае значэнне для ўмацавання светапогляд-

Источник: "Беларуская думка" - №9, 2014-09-22





ных працэсаў у сучаснай Беларусі. Варта пагадзіцца з ацэнкай расійскага гісторыка І.І. Лапо, які сцвярджаў: дзяржаўнае значэнне мовы павінна быць пастаўлена побач з літаратурным яго значэннем у яго выпрацоўцы і ператварэнні з жывой народнай гаворкі, рознамясцовай і часта даволі непадобнай, у моцную і развітую дзяржаўна-літаратурную мову, яна пастаянна развіваецца і ўдасканальваецца, сілкуецца прытокам розных народных элементаў, якія выпрацоўваюць новыя словы і тэрміны тэарэтычнай і абстрактнай думкі *[6, с. 337–338]*.

## Стваральная праца беларускіх дзеячаў

Разам з тым у гэты перыяд адбываўся працэс секулярызацыі культуры, набіраў сілу свецкі кірунак у жывапісе, літаратуры, развівалася прыродазнаўства і тэхнічная навука. Многія выхадцы з беларускіх зямель унеслі значны ўклад не толькі ў развіццё гуманітарных, але і навукова-тэхнічных ведаў. Не можа не выклікаць захаплення імя нашага суайчынніка Казіміра Семяновіча (каля 1600 – пасля 1651). У 1650 годзе ён апублікаваў сваю галоўную кнігу «Вялікае мастацтва артылерыі, частка першая», у якой абгрунтаваў ідэю шматступеннай ракеты, падмацаваўшы свае вынаходніцтва падрабязнымі чарцяжамі і малюнкамі. Ідэі гэтага навукоўца, выкладзеныя ў яго працы, прыкладна на 250 гадоў апярэдзілі высновы К.Э. Цыялкоўскага. На працягу больш як 150 гадоў навуковая праца Семяновіча была найбольш грунтоўнай і аўтарытэтнай па пытанні выкарыстання артылерыі, перавыдавалася і перакладалася на многія еўрапейскія мовы.

У шэрагу лідараў нацыянальнай навуковай думкі патрэбна назваць Ілью Капіевіча (1651–1714), стваральніка грамадзянскага шрыфту. Спярша Капіевіч быў настаўнікам Пятра I у Амстэрдаме, пазней запрошаны царом на працу ў Маскву. З 1699 па 1706 год ён пераклаў і выдаў больш за 20 кніг, склаў першую рускую карту зорнага неба, у навуковы ўжытак увёў такія тэрміны, як «вертыкаль», «гарызонт», «градус», «компас», «паралель», «полюс», «экватар», «экліптыка», а ў кнігадрукаванне – арабскія лічбы. Дзякуючы яго кнігам, многія змаглі пазнаёміцца з дасягненнямі еўрапейскай навукі, яе духоўным і культурным багаццем.

Прызнаным спецыялістам у галіне батанікі, геалогіі, мінералогіі, заалогіі, ветэрынарыі і сельскагаспадарчай навукі быў ураджэнец Лідчыны Станіслаў Юндзіл (1761–1847). Ён адным з першых вывучаў раслінны свет Беларусі, напісаў у 1791 годзе кнігу «Апісанне дзікарослых раслін у правінцыі Вялікага Княства Літоўскага, зробленае па сістэме Лінея», у якасці падручнікаў падрыхтаваў «Асновы батанікі» і «Кароткі курс заалогіі». Вялікую цікавасць выклікалі яго навуковыя працы «Аб саляных радовішчах і солі ў Стоклішках» і «Прыкладная батаніка, або звесткі пра ўласцівасці і ўжытак раслін у гандлі, эканоміцы, рукадзеллі, пра іх радзіму, размнажэнне і догляд». Намаганнямі Юндзіла ў Віленскім універсітэце была створана найбагацейшая калекцыя раслін, якая, дзякуючы яго актыўнай карэспандэнцыі і абмену з айчыннымі і замежнымі батанікамі, налічвала 6500 відаў.

Малавядома, але факт, што ўраджэнец Магілёва, таленавіты прыродазнавец, біёлаг-эвалюцыяніст, батанік-сістэматык Павел Фёдаравіч Гаранінаў (1796–1865) на 25 гадоў раней за Чарльза Дарвіна тэарэтычна абгрунтаваў эвалюцыйную тэорыю паходжання расліннага і жывёльнага свету.

У гісторыі беларускага народа тысячы і тысячы прыкладаў стваральнай працы беларускіх дзеячаў, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё навукі, грамадска-гуманітарную практыку і культуру. Іх дасягненні атрымлівалі прызнанне не толькі на радзіме, але і ва ўсёй еўрапейскай супольнасці. Па глыбіні пранікнення ў народныя масы, традыцыях яны ніколькі не саступалі культуры «польскага народа шляхецкага», выклікаючы пачуццё павагі і захаплення. Таму сучасным беларусам не толькі можна, але і неабходна ганарыцца дасягненнямі нашых суайчыннікаў у галіне культуры і навукі.

На жаль, мы працяглы перыяд не надавалі належнай увагі вывучэнню і папулярызацыі гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, а таксама навуковым дасягненням шматлікіх прадстаўнікоў беларускага народа. Варта мець на ўвазе і той факт, што праблема этнагенезу беларусаў, як і іншых народаў, застаецца адной з найбольш складаных і дыскусійных у сучаснай

Источник: "Беларуская думка" - №9, 2014-09-22








◀▲У археалагічным музеі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

гістарычнай навуцы. Да гэтага часу беларуская ідэнтычнасць лічыцца да пэўнай ступені адкрытым пытаннем, аб чым сведчаць шматлікія спробы рэканструкцый. Некаторыя прыхільнікі фарміравання аднабакова еўразійскага, г.зн. нееўрапейскага развіцця Беларусі, прапануюць «праграму імпартазамяшчэння ідэй», у якой, аказваецца, паміж Вялікім Княствам Літоўскім, Рэччу Паспалітай і Беларуссю няма ніякай сувязі, а вядомыя беларускія роды Забелаў, Агінскіх, Сапегаў, Статкевічаў, Тышкевічаў, Храптовічаў і іншых не маюць нічога агульнага з беларускай гісторыяй і культурай. Такія сцвярджэнні не забяспечаны неабходным навуковым абгрунтаваннем і прыстасаваны дзеля адстойвання пэўных палітычных уяўленняў. Дарэчы, мы ўжо аднойчы глядзелі на гісторыю праз прызму камуністычнай ідэалогіі, выкрэсліваючы тыя ці іншыя гістарычныя перыяды і многія імёны.

Беларускі народ абавязаны ганарыцца ўсімі тымі, хто адстойваў на ратных палях свабоду і незалежнасць Айчыны, унёс значны ўклад у айчынную духоўна-культурную скарбніцу, грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні краіны.

Варта заўважыць, што этнічная самасвядомасць – гэта складаны і шматфактарны маральна-псіхалагічны стан асобы, што праяўляецца не толькі свядома, але і на падсвядомым узроўні. Гэта своеасаблівы духоўна-светапоглядны маркёр, які дазваляе чалавеку ўсведамляць сваю прыналежнасць да пэўнай этнагенетычнай групы народа, адчуваць роднасць і агульнасць этнакультурнага паходжання. Этнічная самасвядомасць мае не толькі знешнюю, але і ўнутраную глыбінную сутнасць, якая закадзіравана і замацавана на генетычным узроўні і можа праяўляцца праз стагоддзі, яе цяжка разбурыць, пра што пераканаўча сведчыць вопыт беларускай нацыі.

*(Працяг будзе)*

## ЛІТАРАТУРА

1. Совещание с ведущими учеными в Национальной академии наук Беларуси по вопросу перспектив развития науки, 31 марта 2014 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/aleksandr-lukashenko-provel-soveschanie-po-voprosu-perspektiv-razvitija-nauki-8393. – Дата доступа:. 31.03.2014.
2. Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв. / О.Н. Левко [и др.]; редкол.: А.А. Коваленя (гл. ред.); науч. ред. О.Н. Левко; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск: Беларус. навука, 2012. – 743 с.
3. Лысенко, П.Ф. Туровская земля IX–XIII вв. / П.Ф. Лысенко. – 2-е изд. – Минск: Беларус. навука, 2001. – 268 с.
4. Вялікае Княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 3 т. – Т. 3: Дадатак. А – Я. – Мінск, 2010. – 696 с.
5. Журавский, А.И. Деловая письменность в системе старобелорусского литературного языка / А.И. Журавский // Восточнославянское и общее языкознание. – М., 1978. – С. 185–191.
6. Лаппо, И.И. Литовский статут 1588 года: т. 1–2 / И.И. Лаппо. – Т. 1, ч. 2. – Каунас, 1936.